# РЫБАКОВЫ (БРАТЫ)

## Рыбакоў Васіль Аляксеевіч



**Месца нараджэння:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата нараджэння:** 1922

**Дата смерці:** май 1942

**Месца подзвігу:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1941–1942

**Ушанаванне:** г. Орша – вуліца, праезд, мемарыяльная дошка

## Рыбакоў Аляксей Аляксеевіч



**Месца нараджэння:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата нараджэння:** 1925

**Дата смерці:** красавік 1944

**Месца подзвігу:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1941–1944

**Ушанаванне:** г. Орша – вуліца, праезд, мемарыяльная дошка

Удзельнікі Аршанскага падполля. В. А. Рыбакоў – кіраўнік камсамольскай разведвальна-дыверсійнай групы. Група дзейнічала на Аршанскім чыгуначным вузле. Са жніўня 1941 г. да мая 1942 г. яе ўзначальваў В. А. Рыбакоў, з мая 1942-га да красавіка 1944-га – А. А. Рыбакоў. У доме Рыбаковых патрыёты захоўвалі зброю, боепрыпасы, антыфашысцкія лістоўкі. В. А. Рыбакова акупанты загубілі ў маі 1942 года, А. А. Рыбакоў загінуў у красавіку 1944 года.

Імем братоў Рыбаковых названы вуліца і праезд у г. Орша Віцебскай вобласці. У 1975 годзе на доме, у якім падчас Вялікай Айчыннай вайны жылі браты, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**ЛІТІРАТУРА**


1. **Дулеба, Г. І.** Мемарыяльная дошка Рыбаковым / Г. І. Дулеба // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 94.
2. **Королева, А.** Братья Рыбаковы / А. Королева // Аршанская газета. – 2010. – 11 лют. – С. 3.
3. **Крашанiннікаў, Я.** Людзі з легенды / Я. Крашанiннікаў // Ленінскі прызыў (Орша). – 1974. – 12 ліп. – С. 2.
4. **Новая** гісторыя вуліцы // Ленінскі прызыў (Орша). – 1976. – 11 жн. – С. 2.
5. **Рыбаковы** // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 524–525.
6. **Яршоў, І.** Браты / І. Яршоў // Телеком-экспресс (Орша). – 2009. – 1 окт. – С. 7.

**Королева, А.** Братья Рыбаковы / А. Королева // Аршанская газета. – 2010. – 11 лют. – С. 3.

# БРАТЬЯ РЫБАКОВЫ

На доме № 43 по улице Чугуночной долгое время находилась мемориальная доска в память о братьях Рыбаковых. Именно здесь герои нашего города жили до начала войны. Именем братьев Рыбаковых названы улица и проезд в г. Орше. В годы Великой Отечественной войны Василий и Алексей Рыбаковы были участниками Оршанского коммунистического подполья.

Известно, что Василий Алексеевич (1922 г. – май 1942 г.) с августа 1941 по май 1942 года являлся руководителем подпольной группы «Орлята», созданной из комсомольцев, проживавших по улице Чугуночной в Орше, и действовавшей на Оршанском железнодорожном узле. В ее состав входил тоже с августа 1941 года и второй Рыбаков – Алексей Алексеевич (1925 г. – апрель 1944 г.). После смерти Василия, который был выслежен врагом, арестован и после пыток повешен, руководителем группы стал Алексей.

При подготовке взрыва моста в районе железнодорожного узла подпольщиков во главе с Алексеем Рыбаковым арестовали и расстреляли. Алексей Алексеевич посмертно награжден медалью «Партизану Отечественной войны» I степени.

Во время Великой Отечественной войны подпольщики группы «Орлята» под руководством братьев Рыбаковых бутылками с горючей смесью уничтожали вражеские вагоны с боеприпасами, засыпали песок в буксы подвижного состава, закладывали магнитные мины в проходящие поезда. Ими был уничтожен вагон с гитлеровскими офицерами, два паровоза и кран на угольном складе. Участники подполья собирали оружие, боеприпасы, обмундирование для партизан, подавали сигналы советским летчикам, бомбившим железнодорожный узел.

***А. Королева***

**Рыбаковы** // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 524–525.

**РЫБАКОВЫ**

Братья, участники Оршанского коммунистического подполья в годы Великой Отечественной войны.

Василий Алексеевич (1922 г. – май 1942 г.). Родился в г. Орша Витебской области. Член ВЛКСМ. С августа 1941 г. по май 1942 г. – руководитель подпольной группы «Орлята», созданной из комсомольцев, проживавших по ул. Чугуночной в Орше, и действовавшей на Оршанском железнодорожном узле.

Алексей Алексеевич (1925 г. – апрель 1944 г.). Родился там же. Член ВЛКСМ. С августа 1941-го – член подпольной группы «Орлята», с мая 1942 г. – ее руководитель. Подпольщики бутылками с горючей смесью уничтожали вражеские вагоны с боеприпасами, засыпали песок в буксы подвижного состава, закладывали магнитные мины в проходящие поезда, уничтожили вагон с гитлеровскими офицерами, 2 паровоза и кран на угольном складе. Собирали оружие, боеприпасы, обмундирование для партизан, подавали сигналы советским летчикам, бомбившим железнодорожный узел, добывали разведданные для прибывшей из Москвы спецгруппы. Враги выследили Василия, арестовали и после пыток повесили. В апреле 1944 г. в группу проник провокатор. При подготовке взрыва моста в районе железнодорожного узла подпольщики во главе с Алексеем Рыбаковым были арестованы и расстреляны. Алексей Рыбаков посмертно награжден медалью «Партизану Отечественной войны» I степени.

Именем братьев Рыбаковых названы улица и проезд в г. Орша; на доме № 43 по ул. Железнодорожная, где жили братья, установлена мемориальная доска.

**Яршоў, І.** Браты / І. Яршоў // Телеком-экспресс (Орша). – 2009. – 1 окт. – С. 7.

# БРАТЫ

На вуліцы Чыгуначнай здаўна жыла сям'я Рыбаковых. Маці – Марыя Фамінічна і два яе сыны. Старэйшы Васіль напярэдадні вайны ўладкаваўся на працу ў чыгуначнае дэпо, малодшы Аляксей вучыўся ў школе. Вучыўся старанна. Штодзённай упартай вучобай набліжаў здзяйсненне сваёй даўняй мары – стаць інжынерам. Вайна крута перамяніла ўсе хлапчуковыя мары, планы і надзеі. Стратэгічна важны аршанскі чыгуначны вузел перайшоў на кругласутачны рэжым працы. Рамонт цягнікоў стаў больш хуткім. Яны вялі да фронта эшалоны з людзьмі, зброяй, тэхнікай, боепрыпасамі, харчаваннем, словам, усім тым, што было патрэбна для барацьбы з наступаючым ворагам. Браты ўступілі ў атрад, які нёс патрульную службу на вуліцах горада. У час налётаў варожай авіяцыі адлоўлівалі сігнальшчыкаў, знішчалі дыверсантаў, ахоўвалі стратэгічна важныя аб'екты. Калі фашысты захапілі станцыю, Васіль і Аляксей сталі сведкамі нанясення першага ўдара новай зброяй – «Кацюшамі». Фронт адсоўваўся ўсё далей на Усход. Васіль устанавіў сувязь з аршанскімі падпольшчыкамі, якія дапамаглі арганізаваць маладзёжную дыверсійную групу пад назвай «Арлянята». Неўзабаве яны сваёй мужнасцю, адвагай, смеласцю «гучна» заявілі аб сабе. Дыверсіі на чыгунцы сталі насіць сістэмны характар. У эшалонах і на складах акупантаў маладыя падпольшчыкі здабывалі зброю, боепрыпасы, прадукты харчавання, лекі. Час ад часу сярод мірнага насельніцтва «арлянятамі» распаўсюджваліся лістоўкі, якія неслі праўду аб падзеях на савецка-германскім фронце, заклікалі да барацьбы з ворагам у яго тыле. Нечакана ў маі 1942 года фашысты схапілі Васіля.

Пасля жудасных катаванняў, жорсткіх здзекаў паўтараліся адны і тыя ж пытанні:

– Ты падпольшчык?

Без адказа.

– Ты камсамолец?

Без адказа.

– Назаві імёны сваіх паплечнікаў, і мы даруем табе жыццё.

Маўчанне.

Змардаваны штодзённымі жорсткімі катаваннямі, Васіль у апошні раз убачыў блакітнае неба з-пад шыбеніцы.

Кіраўніцтва групай узяў на сябе Аляксей. Пры ім група вырасла колькасна. Галоўнай рысай у яго кіраўніцтве стала старанная, дэталёвая падрыхтоўка кожнай баявой аперацыі. Апагеем дыверсійнай дзейнасці «Арлянят» стала ўсталяванне магнітнай міны пад вагонам эшалона з жывой сілай праціўніка. І не проста пад вагонам, а пад тым, у якім ехалі афіцэры. Колькаснае павелічэнне групы мела і адмоўны бок. У групу пранік правакатар. У час падрыхтоўкі падрыву Гараднянскага маста амаль усіх членаў групы схапілі. Схапілі і Аляксея Рыбакова. Яны вытрымалі ўсе здзекі і катаванні і не сталі здраднікамі.

***І. Яршоў***